ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 300 (1267) НЯДЗЕЛЯ, 28-га сьнежня 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . . 3 р. 30 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25,
сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

Да ведама райкамолаў, ячэек і дэлегатаў Х-га зьезду ЛКСМБ

Цэнтральны Камітэт ЛКСМБ паведамляе, што Х-ты зьезд ЛКСМБ адчыняецца 5-га студзеня 1931 году.

ЦК ЛКСМБ.

Агонь па опортуністычнай недаацэнцы важнейшай кампаніі

Да канца ўразумець і поўнасьцю выканаць асноўную палітычную задачу перавыбараў саветаў

„Падняць ролю саветаў у правядзеньні на практыцы ленінскай палітыкі партыі—такая асноўная палітычная задача перавыбараў саветаў".

З гэтай палітычнай установкі аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) вынікае ўся велічыня і палітычная значнасьць тых конкрэтных задач, якія ставяцца партыяй перад комсамолам па ўдзелу яго ў справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў.

Выходзячы з партыйных дырэктыў, ЦК ЛКСМБ вызначыў конкрэтныя мерапрыемствы, выкананьне якіх павінна забясьпечыць найбольшы ўдзел арганізацыі ў перавыбарах—умацненьні органаў дыктатуры пролетарыяту.

Праходзячая кампанія перавыбараў паказвае, што ў паасобных раёнах комсамольскія ячэйкі разгарнулі значную работу як у час падрыхтоўкі, так і ў самыя перавыбары. На конкрэтных прыкладах барацьбы з кулаком за клясава-балядольны савет, арганізацыі павялічваюць свой аўторытэт у масах працоўнай моладзі, узьнімаюць сваю клясавую баядольнасьць.

У такіх раёнах мы маем значнае павялічэньне комсамольцаў у саветах. Так, Асіпавіцкі раён даў у склад новаабраных членаў сельсаветаў 35 проц. комсамольцаў, Крычаўскі—14,29 проц., Мазырскі—12 проц. і г. д.

Аднак, трэба падкрэсьліць, што такое становішча мы маем далёка не ва ўсіх раёнах.

У некаторых раёнах няма ня толькі павялічэньня, але значнае зьмяншэньне комсамольцаў у складзе новаабраных саветаў.

Пры наяўнасьці агульнага зьмяншэньня (па пераабраных 294 сельсаветах) колькасьці комсамольцаў у параўнаньні з мінулым на 2,24 проц., у паасобных сельсаветах Койданаўскага, Астрашыцка-Гарадзецкага, Стара-Дароскага раёнаў не абраны амаль ніводзін комсамолец.

Матар'ялы, якія зьмяшчаюцца ў сёньнешнім нумары нашай газэты, факты, якія выяўлены на куставых нарадах сэкратароў РК ЛКСМБ і трэшце наяўнасьць зьніжэньня проценту комсамольцаў у саветах з усёй сур'ёзнасьцю гаворыць аб палітычнай недаацэнцы значэньня перавыбараў саветаў з боку цэлага шэрагу ячэек і некаторых райкомаў ЛКСМБ.

Асобныя комсамольскія ячэйкі, а нават і райкомы, апынуўшыся ў палоне опортуністычнага дабрабыту, сталі ў баку ад разгорнутай навакол перавыбараў клясавай барацьбы.

Прыкладам праяўленьня такой згідна опортуністычнай практыкі зьяўляецца Бешанковіцкі РК ЛКСМБ. Ён не зрабіў ніякіх вывадаў з кулацкага замаху на забойства актыўнай комсамолкі, якая 4 разы абіралася членам сельсавету.

Палітычная недаацэнка перавыбараў і опортуністычная практыка, якія існуюць у іх асобных месцах,—вось асноўныя прычыны нездавальняючага на сёньня ўдзелу ЛКСМБ у перавыбарах саветаў.

Толькі за гэтым шмат дзе не праведзена амаль ніякай масава-растлумачальнай работы сярод колгаснай бядняцка-батрацкай і серадняцкай моладзі і асабліва дзяўчат.

Менавіта гэтая прычына ляжыць у аснове злачыннага ігнараваньня паасобнымі райкомамі ЛКСМБ дырэктывы ЦК ЛКСМБ аб мобілізацыі „300" для работы ў саветах.

Гэтыя арганізацыі ня здолелі ў патрэбнай ступені накіраваць ўзрослую палітычную актыўнасьць працоўнай моладзі на актыўны ўдзел у перавыбарах, на бязьлітасную барацьбу з кулацтвам.

Падкрэсьліўшы гэта ЦК ЛКСМБ у сваёй пастанове*) з усёй катэгорычнасьцю прапанаваў камітэтам і ячэйкам дабіцца крутога павароту для забясьпечаньня сапраўды бальшавіцкай работы па ўдзелу комсамольцаў і мобілізацыі мас працоўнай моладзі на барацьбу за клясава-вытрыманыя саветы, супроць кулацкіх атак.

Забясьпечыць гэты пералом магчыма толькі тады, калі райкомы і ячэйкі ЛКСМБ з усёй бязьлітаснасьцю ўдараць па опортуністычнай недаацэнцы перавыбараў, калі кожны комсамолец свой практычны ўдзел паставіць на вышыню палітычнай значнасьці гэтай задачы.

Патрэбна безадкладна разгарнуць правядзеньне шэрагу сходаў, конфэрэнцый колгаснай, батрацка-бядняцкай і серадняцкай моладзі і асабліва дзяўчат, дабіваючыся ня толькі найбольшага іх колькаснага ўдзелу, але, што асабліва важна, высокаякаснага ўдзелу, накіраванага на арганізацыю руйнуючага адпору кулаку і яго падгалоскам.

„Перавыбары саветаў павінны ўнесьці карэннае палепшаньне ў самы склад саветаў. Першае месца ў саветах павінна належаць лепшым ударнікам у рабочых цэнтрах, перадавым колгасьнікам—у вёсцы, як партыйным, так і беспартыйным" (З рэзолюцыі аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б).

У пэрыод разгорнутага соцыялістычнага наступу на ўсім фронце, напярэдадні 3-га рашаючага году пяцігодкі, асабліва важна, каб кожны камітэт, кожны комсамолец ясна сабе ўявілі, што „палітычнае значэньне новых выбараў ў саветы заключаецца ў тым, што цяперашнія перавыбары павінны стаць важнейшым сродкам карэннай перабудовы на справе ўсёй работы саветаў, перабудовай у адпаведнасьці з задачамі рэконструкцыйнага пэрыеду" (З пастановы аб'яднанага пленума ЦК і ЦКК УсеКП(б).

Менавіта выходзячы з гэтай важнейшай устаноўкі, комсамольскія арганізацыі павінны будаваць сваю работу, як у справе ўдзелу ў перавыбарах, так і ў штодзённай працы саветаў.

*) Пастанова будзе зьмешчана ў заўтрашнім нумары „ЧЗ."

На першай агульна-гарадзкой парткконфэрэнцыі г. Менску

ПРАМФІНПЛЯН ТРЭЦЯГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ ВЫКАНАЕМ—

запэўніваюць конфэрэнцыю шматлікія дэлегацыі рабочых Менску

Пролетарскі энтузіязм—у лічбах пяцігодкі ў 4 гады

З сьцягамі і лёзунгамі, пад гучныя гукі оркестру і овацый, даўжэзнаю калёнай праходзілі і падымаліся на сцэну прадстаўнікі дэлегацый.

Гэта былі дэлегаты ад тысячных атрадаў пролетарыяту і асьветнікаў гораду Менску, дэлегаты 8-га Усебеларускага зьезду комунальнікаў.

Яны прышлі рапартаваць конфэрэнцыі аб тых бальшавіцкіх перамогах, якіх яны дабіліся пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі на ўсіх вучастках соцыялістычнага будаўніцтва.

Яны прышлі расказаць аб выніках 2-га году пяцігодкі, аб выніках ударнага кварталу, аб падрыхтоўцы да 3-га, штурмавога году пяцігодкі. Гэтыя дэлегацыі ад імя дзесяткаў тысяч рабочых, комсамольцаў і піонэраў прышлі запэўніць конфэрэнцыю ў тым, што, пад кіраўніцтвам партыі і яе Ленінскага ЦК, у барацьбе на два фронты, плян вялікіх работ—пяцігодку ў чатыры гады—выканаюць.

Ад імя 2-тысячнага атраду рабочых чырвонаштандартнай фабрыкі «Кастрычнік» конфэрэнцыю вітае тав. Луговскі.

Плян ударнага кварталу выканалі

— Палкае пролетарскае прывітаньне бальшавікам 1-й гарадзкой партыйнай конфэрэнцыі ад імя 2000 рабочых ф-кі.

Мімаволі ўспамінаюцца малюсенькія саматужныя аддзяленьні Меншвэю, гады тры-чатыры таму назад раскінутыя па ўсіх кутках гораду. А зараз, толькі за першы і другі год пяцігодкі, з іх вырасла магутная, абсталяваная па апошняму слову тэхнікі фабрыка „Кастрычнік" больш чым з 2000 рабочых.

— Я маю гонар,—кажа тав. Луговскі,—заклясьці конфэрэнцыі аб тым, што да адчыненьня конфэрэнцыі 1-шы агрэгат выканаў сустрэчны прамфінплян ударнага кварталу на 100,2 проц.

... 2-гі агрэгат заканчвае сёньня. Мы ўступілі ў вытворчыя манэўры, каб па бальшавіцку сустрэць 3-ці, рашаючы год пяцігодкі.

Наш лепшы адказ гнілой, струхнелай кучцы беларускай інтэлігенцыі — нацдэмам Лёсікам, Ластоўскім—выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады.

Няхай жыве компартыя і яе правадыр тав. Сталін!

Рапарт аб бальшавіцкіх перамогах 2-хтысячнага атраду рабочых пакрываецца бурнымі воплескамі.

Застанемся лепшымі дапаможнікамі партыі ў барацьбе за яе генэральную лінію

Луговскага замяняе прадстаўнік другога пакаленьня фабрыкі—тав. Кагальцоў. Ад імя 1000 чалавек рабочай моладзі фабрыкі ён вітае конфэрэнцыю:

— Комсамол заўжды быў верным памочнікам партыі. Наш комсамольскі агрэгат за лепшую працу атрымаў ад адміністрацыі і партыйнага колектыву фабрыкі пераходны чырвоны сьцяг.

Увесь наш комсамольскі колектыў атрымаў ад ВСНГБ і Фрунзэўскага РК ЛКСМБ пераходны чырвоны сьцяг.

Гэтыя два сьцягі мы моцна трымаем у руках. Нашыя ўдарныя тэмпы на фронце змаганьня за прамфінплян, наш энтузіязм—парукай гэтаму.

З 1-га студзеня пачынаем прампалітбой—новую форму ўцягненьня шырокіх рабочых мас у барацьбу за соцыялізм.

Мы і надалей застанемся лепшымі дапаможнікамі партыі ў барацьбе за яе генэральную лінію.

Няхай жыве „Пяцігодка ў чатыры гады"!

„Былі лепшымі дапаможнікамі бацькоў..."

Трэцяе пакаленьне не стаяла ў баку ад барацьбы за ўдарныя тэмпы. Яно таксама дапамагала бацьком у выкананьні і перавыкананьні прамфінпляну.

Ад імя 150 піонэраў базы „Кастрычнік" рапартуе піонэрка Шмідт.

— Мы былі лепшымі памочнікамі нашых бацькоў у іх змаганьні за пяцігодку ў чатыры гады. Наша база правяла культурна-вытворчыя манэўры, за што і атрымала чырвоны сьцяг.

Так, рука аб руку, піонэры з сваімі бацькамі і братамі, пад кіраўніцтвам партыйнага колектыву ф-кі „Кастрычнік" змагаюцца за плян вялікіх работ.

Нашы перамогі — вынік барацьбы з опортунізмам

Ад імя 1200 рабочых чырвонаштандартнага чыгуналіцейнага заводу „Энэргія" конфэрэнцыю вітае тав. Азаркевіч.

Рабочыя нашага заводу паслалі мяне рапартаваць аб тым, што сустрэчны прамфінплян ударнага кварталу—у 1.270.000 руб.—выканаль.

24-га сьнежня, а 2-й гадзіне дня ударная брыгада тав. Турэйкіна на зборцы цэнтрафуг выкінула чырвоны сьцяжок. Гэта азначала, што брыгада скончыла свой прамфінплян.

Усьлед за ёю, а 2 гадзіне 30 хвілін, выкінула чырвоны сьцяжок ударная брыгада па збору каменадрабілак.

А 3-й гадзіне дня выкінула сьцяжок ударная брыгада тав. Мірскага, якая таксама працуе па зборцы камнедрабілак.

У нас на заводзе з 1223 рабочых—896 ударнікаў. 872 замацаваліся за заводам да канца пяцігодкі.

Наш сустрэчны плян у 47000 рублёў па падпісцы на пазыку „5-годка—у 4 гады"—перавыканалі надпісаліся на 61.000 руб.

Рабочыя заводу дабіліся гэтых перамог дзякуючы таму, што бальшавіцкай мятлою вымелі опортуністычнае кіраўніцтва заводу, пачынаючы ад дырэктара і канчаючы майстрамі цэхаў.

У адказ на контррэволюцыйнае шкодніцтва Рамзіных і іх хаўрусьнікаў беларускіх нац. дэмаў, якія сумесна рыхтавалі інтэрвенцыю супроць СССР, рабочыя заводу далі партыі 39 лепшых ударнікаў.

У падарунак 1-й гарадзкой партконфэрэнцыі мы даем яшчэ 13 лепшых рабочых ударнікаў у шэрагі комуністычнай партыі.

Дазвольце запэўніць вас ад імя рабочых колектыву,—заканчвае тав. Азаркевіч,—што прамфінплян 3-га году пяцігодкі выканаем і перавыканаем.

Ад імя 560 рабочых друкарні імя Сталіна пролетарскае прывітаньне конфэрэнцыі перадае тав. Крайнін.

Наш адказ опортуністам—павялічэньне прамфінпляну на 34 проц.

— Прамфінплян другога году пяцігодкі мы перавыканалі на 9 проц. На 21-XII плян ударнага кварталу выкананы на 93 проц. Па друкарні абвешчаны двухтыднёвік па надрыхтоўцы да 3-га году пяцігодкі.

У адказ ныцікам і малаверам, наш рабочы колектыў павялічыў прамфінплян на трэці год пяцігодкі на 34 проц.

Выплацім пазыку за 6 месяцаў

Ад імя 720 рабочых шчотачнай фабрыкі імя Крупскай конфэрэнцыю вітае тав. Вушакова.

— Другі год пяцігодкі закончылі на 8 дзён раней вызначанага тэрміну. Сустрэчны плян ударнага кварталу адзін цэх закончыў к 14-му сьнежня, на ф-цы абвешчан двухтыднёвік па падрыхтоўцы да 3-га рашаючага году пяцігодкі.

.. Рабочы колектыў фабрыкі абавязаўся выплаціць пазыку „Пяцігодка—у 4 гады" за 6 месяцаў, замест вызначаных 10. На фабрыцы налічваецца 46 ударных брыгад... 570 рабочых законтрактаваліся за фабрыкай да канца пяцігодкі.

Ад імя 2-х тысячнага атраду будаўнікоў конфэрэнцыю вітае тав. Цымэрман.

— У адказ шкоднікам з „Прампартыі" і агентуры польскага фашызму беларускім нац. дэмам—рабочыя пабудовы фабрыкі—кухні абвясьцілі сябе ўдарнікамі. 10 рабочых будаўнікоў з вытворчым стажам ад 8 да 25 год уступаюць у партыю.

Гэтыя рапарты рабочых аб бальшавіцкіх перамогах—лепшая парука таму, што рабочая кляса, пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі, зьмятаючы са шляху ўсіх ныцікаў і малавераў з правага лагеру і іх „левых" памочнікаў—пяцігодку ў чатыры гады выканае. Х. Б.

Усім райкамолам

Памяншэньне комсамольцаў у саветах сьведчыць аб палітычнай недаацэнцы перавыбараў часткай райкамолаў. Цэкамол прапануе пасіліць мобілізацыю ўдзелу комсамольцаў і працоўнай моладзі ў перавыбарах саветаў, павялічыць комсамольскі асяродак. Ход тэлеграфаваць цэкамолу.

ПАЛЯКОЎ.

Ударыць па опортуністычнай недаацэнцы справы перавыбараў саветаў

Удзел комсамолу ў перавыбарах саветаў нездавальняючы. Па 294 сельсаветах процант абраных комсамольцаў зьнізіўся ў параўнаньні з мінулымі на 2,24 проц. Шэраг камітэтаў і ячэек ня сталі на чале актыўнасьці батрацка-бядняцкай моладзі, не даацэньваюць сутнасьці клясавай барацьбы ў справе перавыбараў і апынуліся ў палоне опортуністычнага благапалучча

Задача комсамолу даць бязьлітасны адпор опортуністычнай практыцы, разгарнуць баявыя тэмпы руху савецкай эстафэты, увязаць правядзеньне перавыбараў саветаў з выкананьнем чарговых гаспадарча-палітычных задач на вёсцы і падрыхтоўкай да X-га зьезду ЛКСМБ

Рашуча ўдарыць па вочкаўціраньню кіраўніцтва

У Койданаўскім р-не да справаздачна-перавыбарчай кампаніі праведзена зусім слабая папярэдняя падрыхтоўчая работа.

Шэраг кіраўнікоў сельскіх саветаў не даацэньвае палітычнай важнасьці перавыбарчай кампаніі. Некаторыя сельсаветы зусім не правалі папярэдняй падрыхоўчай работы з батрацтвам, беднатой і жанчынамі. У Станькаўскім, Старынкаўскім, Дабрынёўскім і іншых сельсаветах ні на адным з выбарчых вучасткаў не праведзены сходы жанчын, а сходы беднаты праведзены толькі на некаторых. Зусім ніякай работы не праведзена комсамольскімі ячэйкамі з батрацка-бядняцкай, колгаснай і серадняцкай моладзьдзю.

Наведваньне сходаў выбаршчыкамі нездавальняючае і не перавышае 60 проц., жанчын—ня больш 20 проц., моладзі—30-40 проц.

Паасобныя комсамольскія ячэйкі ня здолелі стаць на чале працоўнай моладзі і організаваць яе на актыўны ўдзел у правядзеньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі. У Станькаўскім сельсавеце з 4 комсамольскіх ячэек ня было ніводнага комсамольца на справаздачна-перавыбарчым сходзе сельсавету. Таксама і партыйныя ячэйкі, якіх налічваецца ў сельсавеце —3, не разгарнулі патрэбнай работы з батрацтвам і беднатою.

Справаздачна-перавыбарчыя сходы саветаў у большасьці праходзяць без актыўнага ўдзелу бядняцка-батрацкіх і колгасных мас вёскі пры зусім слаба разгорнутай крытыцы і самакрытыцы работы сельскіх саветаў. Справаздачна-перавыбарчая кампанія ня ўвязваецца з выкананьнем чарговых гаспадарча-палітычных задач партыі на вёсцы, (хлебазагатоўкі, мобілізацыя вольных сродкаў насельніцтва, організацыя новага прыліву ў колгасы, падрыхтоўка да вясеньняй пасеўнай кампаніі і г. д.). У выніку—мы маем паслабленьне ўвагі грамадзкасьці раёну да выкананьня пляну хлебазагатовак, які выканан толькі на 60-70 проц., плян нарыхтовак ільну і шэрсьці амаль зусім сарваны. Не праведзена ніякай работы па разгортваньню руху савецкай эстафэты.

Кіраўніцтва райкому комсамолу займаецца самаўсьцешэньнем вочкаўціраньнем, гаворачы, што „ў нас усё добра".

Усё гэта патрабуе ад комсамольскай організацыі ўзьняць тэмпы сваёй работы па правядзеньню справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў, шырока разгарнуць работу сярод батрацка-бядняцкай моладзі і асабліва жанчын, мобілізуючы грамадзкасьць усяго раёну на выкананьне чарговых гаспадарча-палітычных задач партыі на вёсцы.

С. Саўрэй.

Выправіць прарывы на хаду

Ужо больш двух тыдняў як расцачалася перавыбарчая кампанія саветаў па Слуцкім раёне. Па шэрагу сельсаветаў і выбарчых пунктах перавыбары ўжо скончаны. Гэта дае магчымасьць падвесьці некаторыя вынікі і даць ацэнку ходу работы па правядзеньню справаздачна-перавыбарчай кампаніі.

Аб чым-жа гавораць вынікі праведзеных перавыбараў.

Наведваньне перавыбарчых сходаў па шэрагу сельсаветаў нездавальняючае. Па Казловіцкім, Амговіцкім, Мялешкаўскім, Прышчацкім і іншых сельсаветах сярэдні процант наведваньня выбарчых сходаў не перавышае 45-50 процантаў, а наведваньне жанчынамі 23-25 проц.

Больш таго, ёсьць сельсаветы, дзе ў новы склад не абрана ніводнага партыйца і комсамольца (Меляшкоўскі с-с, у Бяліцкім сельсавеце не абрана ў склад сельсавету ніводнага рабочага, батрака і колгасьніка.

У шэрагу выбарчых пунктаў перавыбарчыя сходы зрываюцца з прычыны няяўкі выбаршчыкаў (в. Старцовічы і інш.).

З 58 новаабраных членаў сельсаветаў мы маем недапушчальна малы процант абраных жанчын—11 чалавек (15 проц.) і 19 чалавек беднаты.

Бываюць факты, што ў склад сельсавету пралязаюць варожыя нам элемэнты. Так, селькор Цыбук і Люлька пішуць у раённую газэту „Ленінскі Шлях", што падрыхтоўка перавыбарау па Ленінскім сельсавеце праходзіць дрэнна, члены сельсавету і сельсавет бязьдзейнічаюць. У в. Шалавічы адбыўся сход беднаты, дзе абгавараваліся кандыдатуры ў новы склад сельсавету, але дзякуючы адсутнасьці належнай папярэдняй работы сярод беднаты, апошняя не змагла даць рашучага адпору спробам кулацтва працягнуць у склад сельсаветаў свае кандыдатуры—Гарбача і Шахлевіча Лявона, якія выступалі раней супроць колектывізацыі, ды і зараз вядуць работу па зрыву мерапрыемстваў партыі на вёсцы.

Усе вышэйпаданыя факты сьведчаць аб тым, што да справаздачна-перавыбарчай кампаніі па Слуцкім раёне, партыйныя, комсамольскія ячэйкі і іншыя грамадзкія організацыі надта слаба праводзілі работу сярод беднаты і батрацтва, а работа сярод жанчын зусім выпала з кола іх дзейнасьці. У выніку мы маем нездавальняючы новы склад сельскіх саветаў па вышэйадзначаных саветах. Райком партыі, комсамол і РВК павінны з гэтага зрабіць для сябе адпаведныя вынікі і ўжыць зараз-жа тэрміновыя захады, каб выправіць дапушчаныя прарывы. Комсамол павінен мобілізаваць шырокія колы батрацка-бядняцкай і колгаснай моладзі на актыўны ўдзел у справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў і рашучую барацьбу з кулацтвам.

Прыбытак.

Не далі адпору кулаку і яго агэнтам

У Капвіцкім сельсавеце, Мазырскага раёну, слаба праведзена папярэдняя работа па перавыбарах саветаў з батрацтвам, беднатой і колгасьнікамі. У шэрагу перавыбарчых пунктаў кулацтву ўдаецца сарваць правядзеньне ў склад сельсавету намечаных беднатою кандыдатур. Непадрыхтаваная бедната і серадняцтва вёскі Кротава падпала пад уплыў заможнікаў, якія прысутнічалі на сходзе і выступілі супроць вызначаных партыйнай ячэйкай кандыдатур. Заможнікі выставілі свой сьпіс і агітавалі, што ў склад сельсаветаў ня трэба абіраць бедноту і колгасьнікаў.

Партыйная ячэйка і комсамольцы ня здолелі даць патрэбнага адпору гэтым вылазкам. Такім чынам, сход быў сарваны заможнай часткай.

Ударнік.

Ігнаруюць работу сярод жанчын

Перавыбарчая кампанія па шэрагу сельсаветаў Дрысенскага р-ну праходзіць зусім нездавальняюча. Па сельсаветах, дзе ўжо прашлі перавыбары, зусім нізкі процант абраных у склад сельсавету жанчын і нездавальняючы процант наведваньня сходаў выбаршчыкамі.

У Бігосаўскім сельсавеце ў склад сельсавету абрана жанчын толькі 8 проц. У местачковым савеце прысутнічала ня больш 60-70 проц. выбаршчыкаў, адсутнічала амаль поўнасьцю моладзь і комсамольцы.

Агульны недахоп у справаздачна-перавыбарчай кампаніі, гэта—зусім слабая работа сярод жанчын і батрацка-бядняцкай моладзі. **П. К—ак.**

Справаздачна-перавыбарчая кампанія павінна быць стымулам умацаваньня комсамольскай работы на ўсіх франтох соцбудаўніцтва

Нядаўна пры ЦК ЛКСМБ адбылася нарада сэкратароў райкомаў (13 раёнаў) па пытаньню аб ўдзеле ЛКСМБ у справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў і правядзеньні савецкай эстафэты. Папярэднія вынікі ходу справаздачна-перавыбарчай кампаніі сьведчаць аб тым, што батрацтва, бедната і колгасьнікі, наперакор усялякім спробам клясавага ворага-кулакоў і яго агентаў правых і „левых" опортуністых—праяўляюць вялікую актыўнасьць па ажыцьцяўленьню генэральнай лініі партыі па выкананьню пяцігодкі ў чатыры гады.

Батрацтва, бедната і колгасьнікі пад кіраўніцтвам партыі даюць самы рашучы адпор усялякім спробам кулацтва перашкодзіць пасьпяховаму правядзеньню справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў і выкананьню чарговых гаспадарча-палітычных кампаній, адказваючы на вылазкі клясавага ворага ўздымам новага прыліву ў колгасы і організацыяй новых колгасаў.

Комсамольскія ячэйкі пад кіраўніцтвам партыйных ячэек правялі значную работу сярод масы працоўнай батрацкай і бядняцкай моладзі вёскі. У шэрагу раёнаў па сельсаветах праведзены сходы батрацка-бядняцкай моладзі, таксама праведзены шэраг раённых конфэрэнцый па пытаньню аб задачах моладзі ў правядзеньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў, выкананьні чарговых палітычна-гаспадарчых кампаній, барацьбе з кулацтвам, за падбор клясава-вытрыманых кандыдатур у новы склад саветаў.

Бягомельская, Койданаўская і іншыя раённыя комсамольскія організацыі правялі значную работу па праверцы дзейнасьці сельскіх саветаў. Гэтыя раённыя організацыі, апрача правядзеньня райконфэрэнцыі батрацка-бядняцкай моладзі, правялі райзьлёты „лёгкай кавалерыі", якая разгарнула практычную работу па праверцы дзейнасьці сельсавету.

У Койданаве адбылася вялікая дэманстрацыя працоўных, прысьвечаная перавыбарам саветаў.

У Чэрвеньскім раёне комсамольская організацыя, апрача організацыі батрацка-бядняцкіх колаў на актыўны ўдзел у справаздачна-перавыбарчай кампаніі, правяла значную работу па збору прапаноў ў новы наказ Гарсавету. Комсамольцамі і моладзьдзю сабрана ў наказ 36 прапаноў.

Аднак, вышэйпералічаныя факты ні ў якім разе ня могуць служыць здавальняючай ацэнкай удзелу комсамолу ў справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў. Комсамольскія ячэйкі амаль зусім выпусьцілі работу сярод жанчын.

Таксама работа сярод батрацка-бядняцкай моладзі далёка не дастаткова. Сходы колгаснай батрацка-бядняцкай моладзі праводзіліся толькі ў раёнах асобнымі ячэйкамі.

Такім чынам, удзел моладзі ў справаздачна-перавыбарчай кампаніі невыстарчальны.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія праходзіць ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы. Кулацтва, якое партыя і рабочая кляса ліквідуе на базе суцэльнай колектывізацыі, як клясу, імкнецца пасадзіць сваіх прахвоста-нікоў у саветы з тым, каб паслабіць клясавую баяздольнасьць органаў дыктатуры пролетарыяту. Клясава-варожая дзейнасьць кулакоў выяўляецца і ў тым, што ў шэрагу месц на вучастках выбарчых сходаў кулацтва праводзіла папярэднюю працу па падрыхтоўцы сваіх кандыдатур і компромэтацыі кандыдатур, якія высунуты партыйнымі ячэйкамі і групамі беднаты. На справаздачна-перавыбарчых сходах кулацтва імкнулася організавацца з тым, каб сарваць правядзеньне партыйных кандыдатур. Так, у Самахвалавіцкім раёне на адным выбарчым пункце заможнікі выступалі супроць кандыдатур партыйцаў і комсамольцаў, кажучы:—„ня трэба абіраць комсамольцаў у склад сельсавету, бо яны актыўна ўдзельнічалі ў высяленьні кулакоў". У Смалявіцкім раёне, падбухтораны кулацтвам бядняк выступаў супроць кандыдатуры партыйца, кажучы, што „ня трэба яго абіраць у склад сельсавету, бо ён усіх пагоніць у колгас".

Але дзякуючы праведзенай партыйнымі ячэйкамі рабоце, бедната, батрацтва і серадзнякі даюць рашучы адпор гэтым вылазкам клясавага ворага.

Недапушчальна марудна выконваецца дырэктыва ЦК ЛКСМБ аб мобілізацыі 300 комсамольцаў на сталую работу ў сельсаветы. Гэта важнейшае палітычнае мерапрыемства ў паасобных раёнах (Барысаў, Чэрвень, Пяшчаніцы і інш.) знаходзіцца пад поўнай пагрозай зрыву. Гэтыя раёны не растлумачылі палітычную важнасьць мобілізацыі комсамольцаў на ўмацаваньне сельсаветаў работнікамі, не давялі да ведама шырокіх мас комсамольцаў пастанову ЦВК БССР аб тым, што за таварышамі, якія ідуць на сталую працу ў сельсаветы, захоўваецца на працягу 2 год іх сярэдняя зарплата.

Разам з гэтым нельга не адзначыць, што комсамольскія ячэйкі часьцяком недастаткова паказваюць свой палітычны твар у правядзеньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў, не адчуваюцца, як організатары шырокіх колаў батрацка-бядняцкай моладзі, а знаходзяцца на пабягушках, выконваюць тэхнічны бок працы: зьбіраньне сходаў, разноска абвестак і г. д. Ячэйкі не праверылі работу комсамольцаў членаў сельсавету, адрываюць правядзеньне справаздачна-перавыбарчых кампаній саветаў ад правядзеньня чарговых гаспадарча-палітычных мерапрыемстваў партыі на вёсцы. З 13 раёнаў толькі 2 уключыліся ў правядзеньне савецкай эстафэты.

Усё гэта ставіць перад кожным камітэтам і комсамольскай ячэйкай неадкладную задачу—шырока разгарнуць работу сярод батрацка-бядняцкай моладзі і жанчын, стаць палітычным кіраўніком узросшай актыўнасьці працоўнай моладзі, організаваць яе на актыўны ўдзел у справаздачна-перавыбарчай кампаніі, на рашучую барацьбу з кулацтвам і яго агентамі, увязаць правядзеньне справаздачна-перавыбарчай кампаніі з задачамі організацыі новага прыліву ў колгасы, пасіліць тэмпы правядзеньня хлебазагатовак і мобілізацыі сродкаў насельніцтва, дабіцца ў кожным застаўшымся перавыбарчым пункце 100 проц. удзелу выбаршчыкаў і разгортваньня шырокай самакрытыкі ўсіх недахопаў у рабоце сельскіх саветаў.

Комсамольскія камітэты і ячэйкі павінны зараз-жа шырока разгарнуць работу па выкананьню дырэктыў ЦК аб мобілізацыі 300 комсамольцаў на сталую работу ў сельсаветы, растлумачыць пастанову ЦВК БССР па гэтаму пытаньню.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія павінна яшчэ больш спрыяць задачы ўмацаваньня комсамольскай работы на ўсіх фронтах соцыялістычнага будаўніцтва на вёсцы

ЮДЗЯНКОЎ.

Саветы на актыўную барацьбу за генэральную лінію партыі



Узбекістан рыхтуецца да перавыбараў саветаў. На здымку: плякат на тэму: „за баваўняную незалежнасьць". Плякат адбівае барацьбу за канчатковае вызваленьне СССР ад увозу імпортнай баваўны ў 1932 г. У цэнтры—фігура старшыні ЦВК Узбекістана т. Ахун Бабаева

Юнкораўскі дазор нам піша

* Перавыбары Слуцкага сельсавету пачнуцца з 1 студзеня. Комсамольскія ячэйкі і іншыя грамадзкія організацыі ўжо зараз разгарнулі шырокую масавую работу па падрыхтоўцы да перавыбараў Гарсавету.

У клюбе і гуртках праведзены адпаведныя гутаркі аб задачах справаздачна-перавыбарчай кампаніі. Па ўсіх выбарчых пунктах намячаецца правядзеньне сходаў, вечароў, прысьвечаных перавыбарам Гарсавету.

П.

* Рабселькоры Сьмілаўшчыны з 1-га сьнежня ўключыліся ў правядзеньне савецкай эстафэты. Селькоры абвясьцілі сябе ўдарнымі па правядзеньню справаздачна-перавыбарчай кампаніі. Пры ўсіх хатах-чытальнях выдаюцца насьценныя газэты, у якіх шырока асьвятляюцца задачы правядзеньня справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў і работа сельскіх саветаў. Складзены юнкораўскія брыгады, якія правяраюць работу сельскіх саветаў.

Лявіцкі.

* Комсамольская ячэйка в. Таль (Любаньскі р-н) налічвае звыш 45 комсамольцаў, але ніякай работы з батрацка-бядняцкай моладзьдзю па падрыхтоўцы да справаздачна-перавыбарчай кампаніі сельскіх саветаў не праводзіць.

Бяброўскі.

* Даманавіцкі кустком ЛКСМБ (Мазырскі р-н) яднае 6 ячэек з 96 комсамольцаў. Ніякай работы па падрыхтоўцы справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў кустком не праводзіць. Комсамольскія ячэйкі не абгаварвалі кандыдатур комсамольцаў і моладзі ў новы склад сельсавету. **Мусьніцкі.**

БРЫГАДА „ЧЫРВОНАИ ЗЬМЕНЫ“ У ГОМЕЛІ

СПРАВА У САВПАРТШКОЛЕ—ТРЫВОЖНЫ СЫГНАЛ

аб бязумоўным неблагапалуччы ў рабоце Гомельскай арганізацыі па ажыцьцяўленьню нацпалітыкі партыі

Праводзячы мерапрыемствы баявой дзесяцідзёнкі, месячніка беларусізацыі—Гомельская арганізацыя павінна дабіцца бальшавіцкай непрымірымасьці да ўсялякіх скажэньняў партыйнай лініі ў нацыянальным пытаньні

ПАСТАНОВА

Бюро ЦК ЛКСМБ ад 23-XII—30 г. па інфармацыі тав. Умрэйкі аб адносінах камсамольскай ячэйкі Гомельскай савпартшколы і ГК ЛКСМБ да пастаноўкі контррэволюцыйнай нацыянал-дэмакратычнай п'есы „ПЕРАМЕНА“

1. Бюро ЦК ЛКСМБ расцэньвае пастаноўку ва Ўсебеларускай савпартшколе п'есы „Перамена“, у якой з усёй яскравасьцю адбіваюцца контррэволюцыйныя нацыянал-дэмакратычныя погляды (тэорыя самабытнасьці, адмаўленьне наяўнасьці ў Беларусі клясавай барацьбы і г. д.), як адкрытую вылазку контррэволюцыйнага нацыянал-дэмакратызму.

2. Бюро ЦК констатуе, што бюро і ўся ячэйка ЛКСМБ СПШ, недаацаніўшы палітычнай сутнасьці гэтай контррэволюцыйнай вылазкі, прымірэнча да яе аднёсшыся, нават пасьля пастаноў ЦК КП(б)Б, РК КП(б)Б і партколектыву, не рэагавалі на гэтую клясава-варожую вылазку—не прыцягнулі да адказнасьці камсамольцаў, што ўдзельнічалі ў пастаноўцы п'есы, не ствараылі вакол гэтага адпаведнай грамадзкай думкі, праявіўшы гэтым самым грубога выгляду палітычную сьлепату.

3. Бюро ЦК лічыць зусім недапушчальным і палітычна шкодным тлумачэньне бюро і сэкратара ячэйкі СПШ аб тым, што „паколькі ў нас 90 проц. камсамольцаў-комуністых і на партколектыве гэтая справа была абгаворана, дык на камсамольскай ячэйцы абгаварваць не патрэбна“, што па сутнасьці зьяўляецца спробай адцягнуць камсамольскую арганізацыю ад непасрэднага ўдзелу ў барацьбе за генэральную лінію партыі, супроць яе скажэньняў.

4. Недаацаніўшы палітычнай сутнасьці нацдэмаўскай вылазкі ў Савпартшколе, праявіўшы ў данным выпадку палітычную сьлепату, бюро Гомельскага Гаркому камсамолу з надзвычайным спазьненьнем (толькі пасьля сыгналаў „Ч. З.“ і выезду прадстаўніка ЦК) рэагавала на адносіны да гэтай справы ячэйкі савпартшколы, і прыняло захады да таго, каб на гэтым конкрэтным факце яшчэ больш мобілізаваць камсамольскія масы на барацьбу за непахіснае ажыцьцяўленьне ленінскіх прынцыпаў нацыянальнай палітыкі.

Выходзячы з гэтага, бюро ЦК ЛКСМБ пастанаўляе:

1. Зацьвердзіць пастанову бюро Гаркому аб роспуску бюро камсамольскай ячэйкі Гомельскай Савпартшколы і вынясеньні суровай вымовы сэкратару ячэйкі ЛКСМБ тав. Лявіціну.

2. Давесьці да ведама Гомельскага Гаркому КП(б)Б аб недапушчальна дрэнным партківраўніцтве ячэйкай ЛКСМБ СПШ і валўнасьці фактаў змазваньня палітычнае ролі камсамольскай арганізацыі, якія месьцяцца ў палітычна памерных выступленьнях паасобных сяброў бюро партколектыву і сэкратара ячэйкі КСМ, што як быццам „КСМ яч. у СПШ нічога ня робіць, яна будзе дубляваць парт. рашэньні, ячэйку трэба ліквідаваць і г. д.“.

3 Прапанаваць Гаркому КСМ у самым тэрміновым парадку правесьці па ўсіх колектывах і ячэйках ЛКСМБ гораду растлумачэньне контррэволюцыйнай нацыянал-дэмакратычнай сутнасьці вылазак у Савпартшколе, дабіўшыся на гэтым конкрэтным факце яшчэ большай мобілізацыі мас камсамольцаў на непрымірымую барацьбу за генэральную лінію партыі.

Праводзячы месячнік беларусізацыі і ўзмацненьня работы сярод нац. меншасьцяў, дзесяцідзёньнік баявой праверкі, выкананьне мерапрыемстваў культэстафэты, Гомельская арганізацыя ЛКСМБ, на чале з ГК, пад кіраўніцтвам партыі, менавіта на гэтых конкрэтных мерапрыемствах барацьбы за ажыцьцяўленьне нацпалітыкі партыі, павінна дабіцца найбольшай непрымірымасьці да ўсіх варожых пролетарыяту вылазак. Наносячы руйнуючы ўдар па вылазках контррэволюцыйнага нацыянал-дэмократызму, рашуча ўзмацняючы работу ў галіне беларусізацыі, Гомельская арганізацыя ЛКСМБ павінна з усёй бязьлітаснасьцю выкрываць і біць па галоўнай небясьпецы—вялікадзяржаўным расійскім шовінізьме, у яго ідэолёгіі і практычных праявах.

4. Маючы на ўвазе, што матар'ялы брыгады „Чырвонай Зьмены“ падаюць надзвычайна трывожныя сыгналы, падкрэсьліваючы, што справа Савпартшколы ёсьць зьвяно з агульнага ланцугу сыгналаў аб бязумоўнай небясьпечнасьці ў становішчы работы Гомельскай гарадзкой арганізацыі ў галіне ажыцьцяўленьня нацпалітыкі партыі, бюро ЦК лічыць неабходным у бліжэйшыя дні заслухаць даклад Гом. ГК ЛКСМБ аб удзеле арганізацыі ў нацыянальна-культурным будаўніцтве—ажыцьцяўленьні нацпалітыкі партыі.

5. Ускласьці падрыхтоўку гэтага пытаньня на брыгаду „Чырвонай Зьмены“ ў Гомелі. Для кіраўніцтва камандыраваць тав. Умрэйку.

6. Гэтую пастанову апублікаваць у друку.



Ненадзейныя конікі,

[illegible] доўгі час ехаў гомельскі РК ЛКСМБ да ўдзелу ў нацкультбуду

Вурокі палітычнай прытупленасьці

Праводзімы зараз гаркамолам і брыгадай „Чырвонай Зьмены“ генэральны агляд удзелу камсамольскай арганізацыі Гомельшчыны ў нацыянальна-культурным будаўніцтве выкрыў шэраг буйнейшых прарываў, палітычных памылак і грубейшых адхіленьняў ад генэральнай лініі партыі ў пытаньнях нацыянальна-культурнага будаўніцтва у шэрагу колектываў камсамольскай арганізацыі. Агляд наметаў конкрэтныя шляхі пералому ў справе аўладаньня беларускай мовай ужываньнем у штодзённай працы і жыцьці шырокіх камсамольскіх мас і працоўнай моладзі, асабліва ўзмацненьня ўдзелу арганізацыі ва ўсім нацкультбудаўніцтве зогул. У шэрагу зьвеньняў гомельскай камсамольскай арганізацыі да сёньнешняга дня яшчэ няма патрэбнага разуменьня таго, што правядзеньне правільнай ленінскай нацыянальнай палітыкі для пролетарыяту і яго партыі—важнейшая задача.

У пошуках „інтэрнацыянальнай“ мовы

Размовы „інтэрнацыяналістых“—заядлыя вялікадзяржаўныя расейскія шовіністыя і нацыянал-опортуністыя р з-важаньні ў большасьці не атрымалі руйнуючага адпору ад камсамолі Гомельшчыны, якія не па-бальшавіцку змагаліся за ажыцьцяўленьне ленінскіх прынцыпаў нацполітыкі. Сьлепата бюро гаркамолу ад опортуністычных выступленьняў прывяла да буйнейшых палітычных прарываў у рабоце часткі ячэек арганізацыі, дзе „камсамольцы“ вялікадзяржаўныя расейскія шовіністыя выступалі з патрабаваньнем замены белмовы „больш прыгожай“ інтэрнацыянальнай мовай (дзяржбанк), дзе „камсамольцы“ разважалі:—„Мяне ня могуць прымусіць адміністрацыйна ўжываць белмову ў штодзённым жыцьці, акр мя заняткаў“ (аўтотрактарны тэхнікум), дзе „камсамольцы“ наадрэз адмовіліся ад ужываньня белмовы, зазначаючы: — „Чытаць беларускую літаратуру і газэту „Чырвоная Зьмена“ ніяк ня прыемна“ (Белпэдтэхнікум і дарожна-будаўнічы тэхнікум).

Некаторыя выступалі супроць ужываньня белмовы больш замаскавана таму, бачыце, што быццам „амаль ўся беларуская літаратура прася нута нацыянал-дэмократызмам“. (Савпартшкола—Ругаль).

„... Ясьлі да коняй ня ходзяць“

Невыпадковы таксама заявы інжынэраў Гомсельмашу, што—„тэхнолёгію нельга перавесьці на белмову, бо тэхнічныя тэрміны не ўкладаюцца ў „вашыя“ беларускія лексыконы і што „ясьлі да коняй ня ходзяць“, гэта азначае, што не спэцыялістыя павінны прыстасоўвацца да мовы беларускай (ва ўмовах БССР), а мова да іх ?!). Камсамол Гомельшчыны, замест таго, каб быць сапраўдным правадніком і рупарам у правядзеньні ленінскай нац палітыкі, сам на практыцы ў шэрагу месц супраціўляецца ёй і саботуе белмову.

Тварам да нац. культ. будаўніцтва не павярнуліся

Гомельская камсамольская арганізацыя, у прыватнасьці гаркамол, не павярнулася тварам да нац. культбудаўніцтва. Гаркамол аказаўся палітычна сьляпым да скажэньня генэральнай лініі партыі ў нац. культ. будаўніцтве па шэрагу буйнейшых ячэек арганізацыі, Гаркам ЛКСМБ ня прыняў сваечасова належных мер па справе вылазкі нацыянал-дэмократаў у савпартшколе, гаворачы: „Гаркамол—не ЦК. Савпартшколай кіруе ЦК, а не Гаркамол (?!)“. І таму, па думцы запра іл гаркому ЛКСМБ, рэагаваць на нац. дэмаўскія вылазкі ў Савпартшколе ня трэба.

Месячнік беларусізацыі правалены

У часткі камсамольскіх ячэек гомельскай арганізацыі месячнік беларусізацыі правалены. Справа з выпіскай беларускіх газэт у катастрофічным становішчы. Фабрыка „Везувій“, дзе працуе больш 2 тысяч рабочых, выпісвае ўсяго 14 экз. „Зьвязды“, Савпартшкола—толькі адзін экзэмпляр „Чырвонай Зьмены“. Гэты сьпіс можна было-б працягваць і далей.

Сход актыву камсамольскай арганізацыі, які адбыўся 22-XII г. г. па пытаньню нац. культ. будаўніцтва, абгаварыўшы матар'ялы, зьмешчаныя ў газэце „Чырвоная Зьмена“, цалкам далучыўся да рэзолюцыі бюро Гаркому ЛКСМБ і прыняў яе аднагалосна, яшчэ раз падкрэсьліўшы гэтым своечасовасьць і палітычную вернасьць сыгналаў „Чырвонай Зьмены“ аб палітычных прарывах на фронце ўдзелу гарадзкой камсамольскай арганізацыі ў нацыянальна-культурным будаўніцтве. Сыгналы з камсамольскай арганізацыі Гомельшчыны—палітычная сьлепата кіраўніцтва да грубейшых адхіленьняў ад генэральнай лініі партыі ў шэрагу ячэек у нацыянальна-культурным будаўніцтве,—павінны зьявіцца вурокам для ўсяе камсамольскае арганізацыі Беларусі.

Віт. Сідарук.

Гомель.

Сыстэма опортуністычных, варожых марксызму-ленінізму, поглядаў

Пастанова Фрунзэўскага райкому КП(б)Б аб палітычных памылках у працы таварыша Маргелава (ячэйкі БНДІ)

Пасьпяховае соцыялістычнае будаўніцтва, рашучае наступленьне на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі па ўсім фронце, ліквідацыя кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай колектывізацыі — выклікаюць шалёную нянавісьць і супраціўленьне клясавых ворагаў.

Абвостраная клясавая барацьба разгортваецца і выяўляецца ня толькі ў падрыве нашага гаспадарчага будаўніцтва, рабочага забясьпечаньня, стварэньні контр-рэволюцыйных арганізацый для правядзеньня шкодніцкай работы і падрыхтоўкі інтэрвэнцыі сумесна з капіталістычнымі дзяржавамі і іх генэральнымі штабамі супроць СССР, але ў ня меншай меры і ня з меншай вайстратою здабываецца клясавая барацьба на навукова-культурным фронце.

Шкодная праца на навуковым фронце разгортваецца па лініі затрыманьня падрыхтоўкі пролетарскіх кодраў, па лініі абароны, падтрыманьня і прапаганды варожых марксызму тэорый. У сваёй працы буржуазныя вучоныя ставілі стаўку на разьвіцьцё нашай гаспадаркі па капіталістычным шляху, складвалі і афармлялі ў адпаведнасьці з гэтым тэорыю гэтага разьвіцьця, абвалаквалі і падпарадквалі свайму ўплыву шэраг менш устойлівых комуністых.

Тав. Маргелаў, працуючы у ВНДІ пад кіраўніцтвам нацдэма Г. Гарэцкага ня толькі ня вёў рашучай барацьбы ў тэорыі і практычнай дзейнасьці з контр-рэволюцыйным нац.-дэмократызмам, але сам цалкам падпаў пад яго ўплыў і праводзіў у сваіх навуковых працах буржуазныя, антымарксысцкія, антыленінскія погляды, абараняючы і праводзячы рэакцыйныя тэорыі буржуазных экономістых (Вэбэр) на экономіку пераходнага пэрыяду.

(„Да пытаньняў аб штандарце“... „Проблема ўраджайнасьці“, „Да пытаньня аб штандарце бэконных заводаў...“ і г. д.).

У популярнай брошуры „Колгасы—адзіны шлях сялянства“, выданай у 1930 г. і прадназначанай для колгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас сялянства, т. Маргелаў ня толькі ня выправіў сваіх былых памылак, але дадаў новыя (тэорыя трох шляхоў разьвіцьця сялянскай гаспадаркі: „капіталістычны, соцыялістычны, затнівальня“) і яўна стаў на пункт погляду правага ўхілу ў пытаньнях колгаснага будаўніцтва.

Тав. Маргелаў у надрукаванай за апошні месяц брошуры „Супроць беларускай кандрацьцеўшчыны“ па цэлым шэрагу пытаньняў праводзіць нацыянал - опортуністычную лінію ў сваёй працы, беручы пад абарону контррэволюцыйных нацдэмократаў (Смоліча, Гарэцкага і інш.)

Усе навукова-дасьледчыя і палітычныя працы тав. Маргелава ўяўляюць сабою цэлую сыстэму опортуністычных, варожых марксызму-ленінізму поглядаў, якія поўнасьцю стаяць на плятформе правага опортунізму і змыкаюцца з контррэволюцыйным нацдэмократызмам у тэорыі і практычнай дзейнасьці.

Тав. Маргелаў, замест сваечасовага прызнаньня сваіх права-опортуністычных памылак, асуджэньня буржуазных антымарксысцкіх, антыленінскіх поглядаў і рашучага выкрыцьця да канца палітычнай шкоднасьці іх—праводзіў двурушніцкую палітыку. Пад націскам крытыкі прызнаўшы свае палітычныя памылкі і абавязаўшыся выступіць з іх крытыкай тав. Маргелаў, ня гледзячы на маючуюся магчымасьць да гэтага часу нічога не зрабіў.

Бюро ячэйкі НДІ, ня гледзячы на сыгналізацыю з боку члена бюро яч. тав. Саніна, замест таго, каб разгарнуць самакрытыку, павесьці рашучую барацьбу з права-опортуністычнымі поглядамі Маргелава, мобілізаваць партыйныя і беспартыйныя масы на барацьбу з правым опортунізмам і контррэволюцыйным нацыянал-дэмократызмам,—цягнулася ў хвасьце, а пры разглядзе справы Маргелава не дало ёй палітычнай ацэнкі, праводзячы прымірэнцтва да поглядаў Маргелава.

Выходзячы з гэтага, бюро Фрунзэўскага РК КП(б)Б пастанаўляе:

1. За непадпарадкаваньне бальшавіцкай самакрытыцы, права-опортуністычных антыпартыйных поглядаў (а Маргелаў абавязаўся падпарадкаваць іх самакрытыцы), што бюро РК расцэньвае, як нежаданьне да канца выкрыць свае антыпартыйныя погляды—змагацца з палітычна-шкоднымі буржуазнымі тэорыямі ў сваіх працах,—вывесьці тав. Маргелава са складу бюро ячэйкі, зьняць з кіруючай працы ў інстытуце рэконструкцыі сельскай гаспадаркі і абвясьціць суровую вымову з папярэджаньнем.

2. Прыняць да ведама заяву тав. Маргелава, зробленую ім у самы апошні час абгаварэньня яго памылак, прызнаўшы яе ў асноўным здавальняючай.

3. Бюро ячэйкі, за несваечасовае і нерашучае рэагаваньне пры разглядзе справы Маргелава,—паставіць на від і прапанаваць прыняць цэлы шэраг мерапрыемстваў, якія-б забясьпечылі разгортваньне самакрытыкі, мобілізацыю партыйных і беспартыйных мас на барацьбу з усякімі праявамі правага опортунізму, „левымі“ загібамі—рэшткамі прыпячэпаўшчыны, шкоднай працай нацдэмократаў і прымірэнчымі адносінамі да ўхілаў.

4. Пастанову апублікаваць у друку і абгаварыць на сходзе ячэйкі.

ПЯЦІГОДКА ПАТРАБУЕ
ФІНАНСАВЫХ СРОДКАЎ

Мобілізацыя фінансавых рэсурсаў праходзіць недапушчальна павольна. У Бяльніцкім раёне ня выкананы плянавыя заданьні. Комсамольскія ячэйкі Бабруйску выяжджаюць на пастановах

Організаваць комсамольскія ашчадкасы

Выканаць плянавыя заданьні

Кожнаму комсамольцу ашчадкніжку—

справа бальшавіцкага гонару кожнай ячэйкі, кожнага камітэту

Патрэбен агульны ўздым

(Гутарка з упаўнаважаным ЦК УсеКП(б)— тав. В. П. Мілюціным)

Да сканчэньня асобнага кварталу і да пачатку новага году засталося некалькі дзён, таму трэба зрабіць усё, каб закончыць належным чынам асобны квартал, узяць адпаведныя тэмпы гаспадарчай работы ў першы-ж месяц новага году

У Беларусі, побач з дасягненьнямі, бясспрэчна ёсьць і рад вельмі буйных недахопаў, на якія трэба зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу і страсануць каго належыць. Асаблівую ўвагу трэба аддаць мобілізацыі фінансавых сродкаў і прасоўваньню прамтавараў да спажыўца. Затрудненьні, якія ёсьць у гэтай галіне, залежаць выключна ад неорганізаванасьці, а часта ад галавацяпства нашых устаноў і організацый.

Кепска працуе кооперацыя. Няма ў ле гібкасьці, плянавасьці і настойлівасьці пры рэалізацыі тавараў. У выніку атрымліваюцца залежы тавараў на складах, іх прытрымліваюць і г. д. Спажывец нездаволены. Тавары псуюцца. Павольнасьць звароту пазбаўляе неабходны прыток сродкаў у фінансавыя органы. Няма сапраўды бальшавіцкага падыходу да гэтай справы ў шэрагу раёнаў.

У фінансавай галіне зьвяртае на сябе ўвагу ў шэрагу раёнаў невыстарчальнае выяўленьне кулакоў і спагнаньне з іх запазычанасьці. Гэта—прамая правага опортунізму на практыцы. Сельска-гаспадарчая крэдытная сыстэма даволі не энэргічна працуе, дрэнна мабілізуе сродкі. Гэта абумоўліваецца скрозь і ўсюды няправільнымі, я-б сказаў несур'ёзнымі, адносінамі да ролі і значэньня фінансаў з боку нашых гаспадарнікаў. З падобнымі адносінамі трэба пакончыць. Трэба, каб затрымак с фінансамі не было.

Работа нашых організацый, і ў асаблівасьці кооперацыі, павінна быць пастаўлена пад глыбокі партыйны і грамадзкі кантроль. Мы ведаем, што ў шэрагу месц апарат кооперацыі быў засьмечаны і працаваў па сутнасьці супроць нас. Патрэбен агульны ўздым, каб выканаць з гонарам задачы, якія стаяць перад намі.

Працаўнікі Бяльніцкай ашчадкасы бязьдзейнічаюць

Мобілізацыя сродкаў у Бяльніцкім раёне праходзіць недапушчальна марудна. Грамадзкая думка вакол гэтага важнейшага мерапрыемства ня складзена. Большасьць устаноў раёну праводзяць гэтую работу габінэтным парадкам, спадзяючыся на самацёк.

Злачынна бязьдзейнічаюць працаўнікі Бяльніцкай ашчадкасы. У выніку—пры рэалізацыі пазыкі „Пяцігодка—у чатыры гады" сабрана падпіскі толькі на 550 руб. Па заданьню належала сабраць 1500 р Работнікі ашчадкас ні разу не выяжджалі на раён.

З-за адсутнасьці працы сярод насельніцтва па мобілізацыі сялянскіх укладаў маецца адліў у 9.000 руб.

Ня лепш справа і ў райспажтаварыстве. Заданьне па рэалізацыі пазыкі выканана на 50 проц., па ўкладах выканана на 4 проц.

Недавыканаў рэалізацыю пазыкі і Райсельбанк. Рэалізавана ўсяго 50 проц. заданьня. Па паявому капіталу выканана 54 проц. заданьняў.

Зусім марудна праходзіць спагнаньне страхоўкі, усяго спагнана 37 проц.

Лёгкі кавалерысты.

Бабрускія комсамольцы—у баку ад важнейшай справы

Месячнік мобілізацыі сродкаў канчаецца. Вынікі яшчэ не падведзены, але факты, якія маюцца ў нашым распараджэньні, гавораць аб слабым удзеле комсамольскіх ячэек Бабруйску ў выкананьні гэтага мерапрыемства.

Комсамольская ячэйка мэблявай фабрыкі імя Халтурына пытаньне аб мобілізацыі сродкаў абгаварыла наогул, ня прыняўшы нічога конкрэтнага. А ў гэтай ячэйцы ёсьць акурат шэраг комсамольцаў, якія ня выплацілі пай у ЦРК. Так, тав. Озік зарабляе 137 р. у месяц, павінен унесьці пай 27 р., унёс-жа ўсяго толькі—8 р., а яшчэ лічыць сябе „прыхільнікам мобілізацыі фінансавых рэсурсаў".

Нічога конкрэтнага не зрабілі і іншыя ячэйкі, абмежаваўшыся толькі формальнымі пастановамі па гэтай справе.

Некаторыя ячэйкі ня ведаюць нават, што ім рабіць. Так, бюро ячэйкі друкарні імя Непагодзіна вынесла пастанову неравесьці ўсіх комсамольцаў на безнаяўны разьлік. Гэта рашэньне не абгаворана на агульным сходзе ячэйкі. Комсамольцы аб ім ня ведаюць.

Ячэйкі, якія сапраўды паказалі прыклад у справе мобілізацыі сродкаў, налічваюцца адзінкамі. Ячэйка саўгасу Жылічы, разьбіўшыся на брыгады, колектыўна выступала на вёсцы для спагнаньня ўсіх відаў плацяжоў. Члены сельсавету тут-жа прымалі ад сялян падатак, страхоўку і самаабкладаньне. Дзякуючы гэтаму, Харлапавіцкі сельсавет, на тэрыторыі якога знаходзіцца ячэйка, пасьпяхова заканчвае выкананьне гадовага фінансавага пляну.

Ячэйка школы Дарбудвучу пастанавіла штомесяц адлічваць у ашчадкасу пэўную суму грошай з кожнага комсамольца. Гэта ўжо праведзена ў жыцьцё.

Райкому комсамолу патрэбна падлічыць вынікі праробленай на гэтаму пытаньню працы і лепшы вопыт распаўсюдзіць на ўсе ячэйкі.

Лыньноў.

Комсамольскія ашчадкасы ў Віцебску

Віцебская організацыя ЛКСМБ ужо правяла шэраг мерапрыемстваў, якія павінны дапамагчы ліквідаваць прарыў у фінпляне ашчадкас. На 10-XII ашчадкасы Віцебшчыны далі адліў індывідуальных укладаў 105000 руб.

Праведзеныя на комсамольскіх сходах даклады аб мобілізацыі сродкаў насельніцтва і разьвіцьці ашчадсправы завастрылі ўвагу працоўнай моладзі вакол гэтага важнейшага пытаньня. Вылучэньне 10 лепшых комсамольцаў-ударнікаў на сталую працу ў ашчадапарат павінна аздаровіць і палепшыць працу ашчадкас, наблізіўшы яе да працоўных. Шэфства комсамольскіх ячэек над ашчадкасамі зьявіцца формай практычнага ўдзелу і рабочага кантролю над працай ашчадкас.

Зусім зразумела, што гэта праца ня можа праводзіцца па кампанейску, а павінна стаць адной з галін комсамольскай работы, пабудаванай на сталых сыстэматычных рэйках. Пачын комсамолу павінен быць ня толькі пашыраны, але і замацаваны шляхам сыстэматычнай праверкі і кіраваньня гэтай працай.

Комсамольскія ячэйкі павінны правесьці сярод комсамольцаў і працоўных на прадпрыемстве шырокую растлумачальную працу аб значэньні фінпляну.

Неабходна ўзяць на грамадзкі буксір ашчадапарат, які не перабудаваў яшчэ сваю працу. Прыцягнуўшы „лёгкую кавалерыю" неабходна праверыць працу ашчадкас, зьнішчаючы бюрократызм, валакіту і непаваротнасьць у працы ашчадапарату, паляпшаючы абслугоўваньне працоўных.

Лепшым мэтадам для набліжэньня ашчадкас да працоўных і ўкараненьня безнаяўных разьлікаў зьяўляецца організацыя самастойных ашчадкас на прадпрыемствах.

Праведзеньне гэтых мерапрыемстваў побач з уцягненьнем у дзяржаўны зварот вольных сродкаў насельніцтва,—палепшыць бытавыя ўмовы працоўных, якія ўсе свае разьлікі па масавых плацяжох, як кватэрплата, вада, сьвятло, ЦРК і інш., змогуць правесьці без траты часу праз ашчадкасы.

Нажаль, гэтага яшчэ не зразумеў шэраг гаспадарнікаў. Яны падыходзяць да вырашэньня гэтай справы ведамсьцьвенна, тармазяць хутчэйшае яе правядзеньне. Ячэйкі на месцох павінны ўзяць на сябе гэту ініцыятыву і дабіцца організацыі ашчадкас і безн. разьлікаў у хутчэйшы час. Пасьпяховае правядзеньня гэтых мерапрыемстваў залежыць і ад таго, наколькі працоўныя зразумеюць значэньне і выгады іх.

Організуючы да X зьезду ЛКСМБ комсамольскае аддзяленьне ашчадкас, комсамол Віцебшчыны павінен забясьпечыць прыкладнасьць у працы яго, апраўданьне яго званьня, дабіўшыся пасьпяховага выкананьня фінпляну гэтага аддзяленьня.

Ячэйкі, вылучыўшы на сталую працу комсамольцаў, павінны трымаць з імі сталую сувязь, кіруючы і дапамагаючы ім у працы. Узмацненьне ашчадапарату комсамольцамі-ўдарнікамі, зьвязанымі з вытворчасьцю, павінна спрыяць ужываньню мэтодаў соцспаборніцтва і ўдарніцтва ў працы ашчадкас.

Ашчадсправа, разьвіцьцё якое залежыць ад удзелу грамадзкасьці, патрабуе згуртаваньня вакол яе сталага актыву. Камісія садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчадсправе, узмацненьне яе правадзейнымі комсамольцамі, брыгадзірамі, вылучэнымі Гарномам на працу па праведзеньню месячніку мобілізацыі сродкаў насельніцтва, павінна зьявіцца асноўным ядром гэтага актыву.

Толькі пры актыўнай працы кожнай комсамольскай ячэйкі, кожнага комсамольца паасобку і актыўным удзеле ўсёй партыйнай і савецкай грамадзкасьці хаб'ёмся выкананьня адной з важнейшых галін фінпляну-ашчадсправы.

Ж. Ш.



— Лёзна-местачковая комсамольская ячэйка не вядзе ніякай комсамольскай працы. Сакратар, тав. Сьвердлін, сам падрывае работу.

Анзорскі.

— Антырэлігійная праца па Лёзьненскім раёне за апошнія 4-5 месяцаў зусім не праводзіцца.

Партыйна-комсамольскія і профэсыйныя організацыі не ўдзяляюць гэтаму пытаньню належнай увагі.

Кароль.

— З Прапойскай профшколы быў выключан вучань - шовініст Сяліцкі, але праз паўгода загадчык школы чамусьці па сваёй ласцы іноў прыняў яго ў школу.

Цікава, чаму быў прыняты Сяліцкі?

Буцяткін.

— За апошні час комсамальская ячэйка пры Вобальскім сельсавеце спыніла сваю працу. Ячэйка не адчуваецца ў працы, яна ня мае ніякага аўторытэту.

Паляўнічы.

Праз 10 дзён пачнуцца перавыбары Слабадзкога сельсавету. Але да апошняга—батрацтва і беднота не організаваны на ўдзел у справаздачна-перавыбарчай кампаніі і на барацьбу з кулацтвам.

Комсамольская ячэйка і сельсавет зусім бязьдзейнічаюць.

Расток.

„Чырвоная Зьмена" дапамагла

• Па допісу „Хто такі Чайкун"? Слуцкі РК ЛКСМБ паведамляе, што факты растраты, падзелу рахункаў на нескарыстаныя грошы, сувязь з кулацка-заможнай часткай вёскі з боку Чайкуна-члена КСМ, старшыні колгасу „КІМ"—пацьвердзіліся. Чайкун з комсамолу выключан. Райком узьняў хадайніцтва перад прокуратурай хутчэй разглядзець справу аб прыцягненьні Чайкуна да адказнасьці.

• Па допісу „Шпаркае будаўніцтва" Капаткевіцкае РК-РСІ паведамляе, што пададзеныя ў допісе факты пацьвердзіліся. За безгаспадарчасьць прэзыдыум Лучыцкага сельсавету аддадзены пад суд.

АДКАЗНЫ РЭДАКТАР—
РЭДКОЛЕГІЯ

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599